ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
А.В.Кадлубай

24.08.2020 г.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
## па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Мэтай дадзеных Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (далей – Метадычныя рэкамендацыі), з'яўляецца ажыццяўленне адзінага падыходу ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (далей – установы адукацыі), да фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў.

2. Метадычныя рэкамендацыі накіраваны на ўзгодненую дзейнасць педагагічных работнікаў па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення пры рэалізацыі вучэбных праграм па вучэбных прадметах, вучэбных праграм факультатыўных заняткаў, правядзенні стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў, кансультацый (далей – дадатковыя заняткі), адукацыйных і выхаваўчых мерапрыемстваў (алімпіяды, канферэнцыі, конкурсы, фестывалі, злёты, выставы, экспедыцыі, іншыя мерапрыемствы), праверцы навучальных, кантрольных і экзаменацыйных работ, выкананых у пісьмовай форме.

3. Метадычныя рэкамендацыі вызначаюць сістэму арганізацыйных мер, якія садзейнічаюць фарміраванню культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў.

4. Камунікатыўныя ўменні і навыкі вучняў развіваюцца пры вывучэнні вучэбных прадметаў, а таксама пры правядзенні дадатковых заняткаў, адукацыйных і выхаваўчых мерапрыемстваў.

5. Пры ажыццяўленні педагагічнымі работнікамі адукацыйнай дзейнасці рэкамендуецца:

праводзіць сістэматычную работу па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу вучняў, азнаямленні з тэрміналагічнай лексікай, звяртаць увагу на сферу ўжывання таго ці іншага тэрміна;

удзяляць увагу на вучэбных і дадатковых занятках паўнавартаснаму ўспрыманню вучнямі вучэбнага тэксту і слова настаўніка – асноўных крыніц вучэбнай інфармацыі, узораў правільна аформленага маўлення;

выкарыстоўваць выразнае чытанне ўголас як адзін з прыёмаў фарміравання культуры вуснага маўлення, як сродак эмацыянальнага і асобаснага асэнсавання тэксту;

выкарыстоўваць прыёмы сэнсавага чытання як сродку фарміравання чытацкай пісьменнасці;

вучыць працаваць з кнігай, электроннымі і іншымі сродкамі навучання, карыстацца даведачнай літаратурай, каталогамі і картатэкамі, падбіраць крыніцы інфармацыі па пэўнай тэме, правільна афармляць вынікі самастойнай работы з крыніцамі інфармацыі (мэтазгодна выкарыстоўваць цытатны матэрыял, складаць тэзісы, канспекты, спісы літаратуры і г.д.);

фарміраваць у вучняў уменні складаць і аналізаваць табліцы, дыяграмы, схемы, вучыць апісваць, характарызаваць, параўноўваць, аналізаваць вучэбны матэрыял, весці дыялог, дыскусію, прыводзіць неабходныя доказы, рабіць высновы і падагульненні;

павышаць культуру вуснага маўлення вучняў, тактоўна выпраўляць памылкі ў адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы;

рабіць разборлівым почыркам усе віды запісаў на класнай дошцы, у класным журнале, у дзённіках і сшытках вучняў з мэтай фарміравання ў вучняў навыкаў акуратнага іх вядзення і афармлення запісаў;

прытрымлівацца ўзору афармлення надпісу на вокладцы сшытка згодна з дадаткам 1 да Метадычных рэкамендацый.

Рэкамендуецца праводзіць пасяджэнні метадычных аб’яднанняў, педагагічнага савета, у тэматыку якіх неабходна ўключаць пытанні культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, а таксама арганізоўваць абмен вопытам педагагічных работнікаў у дадзеным напрамку.

## II. НАВУЧАЛЬНЫЯ І КАНТРОЛЬНЫЯ РАБОТЫ, ЯКІЯ ВЫКОНВАЮЦЦА Ў ПІСЬМОВАЙ ФОРМЕ

6. Асноўнымі відамі работ вучняў на вучэбных занятках ва ўстанове адукацыі і дома з’яўляюцца навучальныя работы, якія выконваюцца ў пісьмовай форме (далей – навучальныя работы).

Да іх адносяцца:

на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

практыкаванні і заданні розных відаў, дыктанты (слоўнікавы, выбарачны, папераджальны, тлумачальны, вольны, творчы і іншыя), спісванне, пераклад, пераказ, сачыненне, тэсты па вучэбных прадметах

”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Матэматыка“;

розныя віды практычных работ па вучэбных прадметах ”Чалавек і свет“, ”Выяўленчае мастацтва“, ”Працоўнае навучанне“;

напісанне літар алфавіта, імя ўласнага і прозвішча, даты, адраса, слоў, сказаў, тэкстаў з апорай на ўзор, віншавальнай паштоўкі па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“, а пры вывучэнні кітайскай мовы – напісанне транскрыпцыйных знакаў напаўдрукаваным шрыфтам слоў і сказаў у транскрыпцыі з апорай на ўзор, найпрасцейшых элементаў іерогліфаў (рыс) і іерогліфаў з апорай на ўзор, рыс у правільным парадку;

на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі:

практыкаванні і заданні розных відаў, тэставыя, лабараторныя і практычныя работы (вопыты) па ўсіх вучэбных прадметах, акрамя вучэбнага прадмета ”Фізічная культура і здароўе“;

дыктанты (слоўнікавы, выбарачны, папераджальны, тлумачальны, вольны, творчы і іншыя), пераклады, пераказы, сачыненні па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“;

сачыненні і іншыя творчыя работы па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“;

напісанне віншаванняў, запрашэнняў, асабістых лістоў, нескладаных дзелавых лістоў (ліста-падзякі, ліста-адказу, ліста-запыту інфармацыі, звестак анкеты, кароткай аўтабіяграфіі, кароткага зместу (рэзюмэ) праслуханага (прачытанага) ці ўбачанага, міні-сачынення, сачынення на прапанаваную тэму па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“, а пры вывучэнні кітайскай мовы дадаткова напісанне нескладаных відаў тэкстаў з дапамогай транскрыпцыйных знакаў, іерогліфаў; сказаў і тэкстаў іерогліфамі; ключавых элементаў іерогліфаў (графем);

дыктанты (лічбавыя, графічныя і іншыя), задачы па вучэбных прадметах ”Матэматыка“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Хімія“, ”Біялогія“, ”Геаграфія“;

пісьмовыя адказы на пытанні, змешчаныя ў падручніках, вучэбных дапаможніках, дыдактычных матэрыялах па ўсіх вучэбных прадметах, акрамя вучэбнага прадмета ”Фізічная культура і здароўе“;

складанне планаў-канспектаў, канспектаў, апорных схем, табліц, дыяграм, алгарытмаў па ўсіх вучэбных прадметах, акрамя вучэбнага прадмета ”Фізічная культура і здароўе“;

заданні з выкарыстаннем насценных і контурных карт, атласаў, рухомай карты зорнага неба і іншых па вучэбных прадметах ”Сусветная гісторыя“, ”Гісторыя Беларусі“, ”Чалавек і свет“, ”Геаграфія“, ”Астраномія“.

7. Колькасць пераказаў, сачыненняў, якія праводзяцца на працягу адных вучэбных заняткаў, аб’ём тэкстаў для пераказаў па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ ў II–IV класах вызначаюцца згодна з дадаткам 2 да Метадычных рэкамендацый.

Віды работ па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення вучняў I–IV класаў вызначаюцца зместам вучэбных праграм па адпаведных вучэбных прадметах і носяць навучальны характар. Адзнакі за пераказы і сачыненні выстаўляюцца ў класны журнал вучням III – IV класаў па меркаванні настаўніка.

У першым паўгоддзі ў V класе па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ праводзяцца толькі навучальныя пераказы, якія ацэньваюцца ў адпаведнасці з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па азначаных вучэбных прадметах для IV класа.

Пераклады і сачыненні па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Беларуская літаратура“, ”Русский язык“, ”Русская литература“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ і ”Літаратура нацыянальнай меншасці“ ў V– VIII класах носяць толькі навучальны характар.

8. На вучэбных занятках ва ўстанове адукацыі выконваюцца кантрольныя работы (далей – кантрольныя работы) па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Беларуская літаратура“, ”Русский язык“, ”Русская литература“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Матэматыка“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Хімія“, ”Біялогія“. Кантрольныя работы па вучэбным прадмеце ”Інфарматыка“ ўключаюць тэарэтычныя пытанні, адказы на якія даюцца ў пісьмовай форме, і практычныя заданні, якія выконваюцца на камп’ютары.

Колькасць кантрольных работ на працягу навучальнага года на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Матэматыка“ і іх віды, а таксама праверка навыку чытання, сфарміраванасці чытацкіх уменняў па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)“, ”Русская литература (литературное чтение)“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“ і навыкаў вуснага лічэння па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ вызначаюцца згодна з дадаткам 3 да Метадычных рэкамендацый.

Колькасць кантрольных работ на працягу навучальнага года на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Беларуская літаратура“, ”Русский язык“, ”Русская литература“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ і іх віды, а таксама колькасць кантрольных работ па вучэбных прадметах ”Матэматыка“,

”Інфарматыка“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Хімія“ і ”Біялогія“ вызначаюцца згодна з дадаткам 4 да Метадычных рэкамендацый.

Аб’ём тэкстаў кантрольных дыктантаў, пераказаў, а таксама аб’ём слоўнікавых дыктантаў, кантрольных сачыненняў вызначаюцца згодна з дадаткам 5 да дадзеных Метадычных рэкамендацый. Колькасць арфаграм і пунктаграм у тэкстах кантрольных дыктантаў па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ вызначаецца згодна з дадаткам 6 да Метадычных рэкамендацый.

Да канца першай чвэрці, а ў V класе на працягу I паўгоддзя захоўваецца аб’ём тэксту, рэкамендаваны для папярэдняга класа.

У вячэрніх класах сумарная колькасць кантрольных работ па вучэбным прадмеце, прадугледжаных на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, раўнамерна размяркоўваецца на ўсе гады навучання.

9. Кантрольныя работы ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, павінны праводзіцца ў адпаведнасці са Спецыфічнымі санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі да зместу і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі, якія зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 07.08.2019 № 525.

## III. КОЛЬКАСЦЬ І ПРЫЗНАЧЭННЕ ВУЧНЁЎСКІХ СШЫТКАЎ

10. Пры ажыццяўленні ўстановамі адукацыі навучання і выхавання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

10.1. навучальныя і кантрольныя работы па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Матэматыка“ вучні I класа выконваюць у адпаведных сшытках на друкаванай аснове;

10.2. для выканання навучальных работ па вучэбным прадмеце ”Выяўленчае мастацтва“ выкарыстоўваецца альбом або набор лістоў для малявання;

10.3. для выканання навучальных і кантрольных работ вучням II–IV класаў рэкамендуецца мець наступную колькасць сшыткаў:

па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Матэматыка“ – 3 сшыткі (2 сшыткі для навучальных работ і 1 сшытак для кантрольных работ). У II класе па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ выкарыстоўваюцца сшыткі з разлінoўкай у вузкую лінейку (без нахіленай лініі), пачынаючы з III класа – сшыткі з разлінoўкай у шырокую лінейку;

па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)“, ”Русская литература (литературное чтение)“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“, ”Чалавек і свет“, “Асновы бяспекі

жыццядзейнасці” – 1 сшытак для навучальных работ па меркаванні настаўніка;

па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“ – 2 сшыткі для навучальных работ; сшытак для запісу замежных слоў – па меркаванні настаўніка;

па вучэбным прадмеце ”Музыка“ – нотны сшытак.

11. Пры ажыццяўленні ўстановамі адукацыі навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі для выканання навучальных і кантрольных работ вучням рэкамендуецца мець наступную колькасць сшыткаў:

па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ – 3 сшыткі (2 сшыткі для навучальных работ і 1 сшытак для кантрольных работ);

па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“ 1 сшытак для навучальных работ – у V–VIII класах; 2 сшыткі (1 сшытак для навучальных работ, 1 сшытак для кантрольных работ) – у IX–XI (XII) класах;

па вучэбным прадмеце ”Літаратура нацыянальнай меншасці“ – 1 сшытак для навучальных работ;

па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“ – 2 сшыткі для навучальных работ; па меркаванні настаўніка дадаткова можна выкарыстоўваць сшытак для запісу замежных слоў. Сшытак для запісу замежных слоў для вучняў X–XI (XII) класаў выкарыстоўваецца па іх жаданні;

па вучэбным прадмеце ”Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)“ – альбом або набор лістоў для малявання, 1 сшытак для навучальных работ;

па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ – 3 сшыткі (2 сшыткі для навучальных работ і 1 сшытак для кантрольных работ);

па вучэбных прадметах ”Інфарматыка“, “Астраномія” – 2 сшыткі (1 сшытак для навучальных работ і 1 сшытак для кантрольных работ);

па вучэбных прадметах ”Чалавек і свет“, ”Сусветная гісторыя“, ”Гісторыя Беларусі“, ”Грамадазнаўства“, ”Працоўнае навучанне“, ”Чарчэнне“ – 1 сшытак для навучальных работ;

па вучэбным прадмеце ”Фізіка“ – 3 сшыткі (1 сшытак для навучальных работ, 1 сшытак для лабараторных работ (лабараторных работ і эксперыментальных даследаванняў) і 1 сшытак для кантрольных работ);

па вучэбным прадмеце ”Біялогія“ – 3 сшыткі (1 сшытак для навучальных работ, 1 сшытак для лабараторных і практычных работ, 1 сшытак для кантрольных работ);

па вучэбным прадмеце ”Хімія“ – 3 сшыткі (1 сшытак для навучальных работ, 1 сшытак для практычных работ і 1 сшытак для кантрольных работ);

па вучэбным прадмеце ”Геаграфія“ – 2 сшыткі (1 сшытак для навучальных работ і 1 сшытак для практычных работ);

па вучэбных прадметах ”Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка“, “Асновы бяспекі жыццядзейнасці” – 1 сшытак для навучальных работ па меркаванні настаўніка.

12. У сшытках для навучальных работ вучні выконваюць работы, якія праводзяцца ў межах паўрочнага і тэматычнага кантролю (класныя, дамашнія, самастойныя, навучальныя пераказы, і іншыя работы), а ў сшытках для кантрольных работ выконваюцца толькі кантрольныя работы, якія ўказаны ў дадатках 3, 4 Метадычных рэкамендацый.

13. Дапускаецца выкарыстоўваць для навучальных, практычных, лабараторных работ і эксперыментальных даследаванняў сшыткі на друкаванай аснове, якія маюць адпаведны грыф. Выкарыстанне рабочых сшыткаў, апорных канспектаў на друкаванай аснове з’яўляецца неабавязковым.

14. Сшыткі для лабараторных работ (лабараторных работ і эксперыментальных даследаванняў) па вучэбным прадмеце ”Фізіка“, сшыткі для практычных работ па вучэбных прадметах ”Хімія“ і “Геаграфія”, сшытак для лабараторных і практычных работ па вучэбным прадмеце ”Біялогія“ захоўваюцца ва ўстанове адукацыі на працягу навучальнага года і выдаюцца вучням для выканання адпаведных работ.

15. Кантрольныя работы па вучэбным прадмеце ”Інфарматыка“ афармляюцца на электронным (практычныя заданні) і папяровым (тэарэтычныя пытанні) носьбіце.

16. Сшыткі для кантрольных работ на працягу навучальнага года выдаюцца вучням на вучэбных занятках для выканання адпаведных работ і работ над памылкамі і захоўваюцца ва ўстанове адукацыі да пачатку наступнага навучальнага года.

## IV. АФАРМЛЕННЕ І ВЯДЗЕННЕ СШЫТКАЎ, АФАРМЛЕННЕ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ РАБОТ

17. Пры афармленні надпісу на вокладцы сшытка ўказваецца, для чаго прызначаецца сшытак (для работ па беларускай мове, для кантрольных работ па матэматыцы, для практычных работ па хіміі, для практычных і лабараторных работ па біялогіі, для лабараторных работ па фізіцы або для лабараторных работ і эксперыментальных даследаванняў па фізіцы і, адпаведна, па іншых вучэбных прадметах), клас (выкарыстоўваюцца арабскія або рымскія лічбы), скарочанае найменне

ўстановы адукацыі ў адпаведнасці са статутам гэтай установы адукацыі, прозвішча і ўласнае імя вучня ў родным склоне.

18. Пры афармленні надпісу на вокладцы сшытка дапускаецца рабіць запіс аб прызначэнні сшытка і найменні ўстановы адукацыі ў два радкі.

19. У I і II класах надпіс на вокладцы сшытка афармляецца настаўнікам, у III і IV класах – вучнем пад кіраўніцтвам настаўніка, у V–XI (XII) класах – вучнем згодна з патрабаваннямі Метадычных рэкамендацый. Памылкі, дапушчаныя вучнямі, выпраўляюцца настаўнікам ручкай з пастай чырвонага колеру.

20. Пры выкананні розных відаў работ вучні павінны захоўваць чырвоны радок, пісаць ад самага пачатку і да самага канца радка, пры неабходнасці падзяляючы словы для пераносу. Усе запісы ў сшытках робяцца ручкай з пастай сіняга або фіялетавага колеру (па рашэнні ўстановы адукацыі) акуратна, разборлівым почыркам, выпраўленні памылковага напісання на правільнае выконваюцца без выкарыстання карэктара. У I класе пры навучанні пісьму вучні могуць выкарыстоўваць аловак замест ручкі.

Падкрэсліванне членаў сказа, выдзяленне марфем у слове, умоўныя абазначэнні, чарцяжы, схемы, графікі, табліцы, дыяграмы, малюнкі выконваюцца акуратна алоўкам (пры неабходнасці каляровымі алоўкамі, акрамя чырвонага) або ручкай, пры неабходнасці – з прымяненнем лінейкі і цыркуля. Не дапускаецца выкарыстанне ў сшытках аплікацый, якія не выконваюць дыдактычных функцый, і фламастараў.

21. Па вучэбных прадметах ”Матэматыка“, ”Фізіка“, ”Астраномія“ ў сшытках для кантрольных работ пры пабудове геаметрычных фігур, графікаў функцый, выкананні малюнкаў, табліц, графікаў і схем вучні могуць выкарыстоўваць каляровыя алоўкі, акрамя чырвонага.

22. Па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“, ”Замежная мова“, ”Матэматыка“ са знешняга боку старонкі сшытка адводзяцца палі (у выпадку іх адсутнасці). Па вучэбных прадметах, па якіх праводзяцца кантрольныя работы, палі адводзяцца і ў сшытку для кантрольных работ.

У II–IV класах дата выканання навучальнай або кантрольнай работы запісваецца пасярэдзіне радка наступным чынам: дзень месяца арабскай лічбай, назва месяца прапіссю.

Напрыклад:

*6 верасня*

На наступным радку (пасярэдзіне) пасля даты ў сшытках для навучальных работ пішацца ”*Класная работа*“ або ”*Дамашняя работа*“.

У сшытках з разлiноўкай у клетку для навучальных работ па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ паміж датай і словамі ”*Класная*

*работа*“ або ”*Дамашняя работа*“ прапускаецца адна клетка ўніз, паміж словамі ”*Класная работа*“ або ”*Дамашняя работа*“ і заданнем – дзве клеткі ўніз.

У сшытках па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“, пачынаючы з II класа, пры афармленні рашэння заданняў на асобным радку ўказваецца від навучальнай работы (слова ”Прыклады“ ў II–IV класах не пішацца). Паміж назвай віду задання, рашэннем і адказам прапускаецца адпаведна адна клетка ўніз, паміж слупкамі прыкладаў, размешчаных адзін пад адным, – дзве клеткі ўніз, паміж слупкамі прыкладаў, размешчаных на адным радку, – тры клеткі ўправа ад найдаўжэйшага прыкладу. Для аддзялення адной навучальнай работы ад другой і для выстаўлення адзнакі прапускаюцца чатыры клеткі ўніз.

У V–XI (XII) класах у сшытках для навучальных і кантрольных работ па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ дата запісваецца словамі ў цэнтры радка. На наступных радках пасля даты пішуцца від работы (пераказ, сачыненне і іншыя); або ”*Работа над памылкамі*“; або ”*Дамашняя работа*“, затым ”*Практыкаванне*“ з указаннем яго нумара (без знака №); або ”*Класная работа*“. Пасля слоў ”*Класная работа*“ на наступным радку па меркаванні настаўніка можа ўказвацца тэма вучэбных заняткаў.

У IX–XI (XII) класах у сшытках для кантрольных работ па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“,”Русская литература“ дата таксама запісваецца словамі ў цэнтры радка. На наступным радку пасля даты ўказваецца від работы (сачыненне), затым – загаловак кантрольнай работы.

Загаловак навучальнай або кантрольнай работы запісваецца на асобным радку без двукосся і кропкі ў канцы назвы. Калі загаловак з’яўляецца цытатай, то ён бярэцца ў двукоссе.

Запісы афармляюцца наступным чынам:

| | | |
|---|---|---|
| *Трэцяга верасня*<br>*Дамашняя работа*<br>*Практыкаванне 12* | *Дваццаць пятага верасня*<br>*Класная работа*<br>*Спосабы ўтварэння дзеясловаў* | *Восьмага кастрычніка*<br>*Работа над памылкамі* |
| *Третье сентября*<br>*Домашняя работа*<br>*Упражнение 12* | *Третье сентября*<br>*Классная работа* | *Третье октября*<br>*Работа над ошибками* |
| *Пятага кастрычніка*<br>*Дыктант*<br>*Мой родны край* | *Пятага кастрычніка*<br>*Пераказ*<br>*У лесе* | *Пятага кастрычніка*<br>*Сачыненне*<br>*З гісторыі майго роду* |

*Пятнаццатага красавіка*
*Сачыненне*
*„Добра быць у дарозе, якую ты*
*сам сабе выбіраеш…“*

У выпадку, калі пісьмовая работа па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ ўключае дадатковае заданне, на наступным радку пасля тэксту ўказваецца нумар варыянта. Нумар задання абазначаецца арабскай лічбай.

Напрыклад: *Варыянт 2* *Варыянт II*
*1.* *1.*

Па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“ дата ў сшытку запісваецца так, як гэта прынята ў краіне мовы, якая вывучаецца:

| | |
|---|---|
| Англійская мова | *1 October 2020* |
| Нямецкая мова | *7. Dezember 2020* |
| Французская мова | *Lundi 7 septembre 2020* |
| Іспанская мова | *7 de diciembre de 2020* |
| Кітайская мова | 2020年4月12日 |

У сшытку для навучальных работ па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“ словы ”*Класная работа*“, ”*Дамашняя раб*ота“ (на адпаведнай мове) не пішуцца.

У V–XI (XII) класах дата выканання навучальнай або кантрольнай работы па іншых вучэбных прадметах, акрамя вучэбных прадметаў ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Замежная мова“, запісваецца лічбамі на палях сшыткаў у адзін ці два радкі.

Напрыклад: *22.09.2020*

У сшытках для навучальных работ па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“, ”Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)“, ”Чалавек і свет“, ”Інфарматыка“, ”Сусветная гісторыя“, ”Гісторыя Беларусі“, ”Грамадазнаўства“, ”Геаграфія“, ”Біялогія“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Хімія”, ”Працоўнае навучанне“, ”Чарчэнне“, ”Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка“, ”Асновы бяспекі жыццядзейнасці“ пры выкананні навучальных работ словы ”*Класная работа*“ не пішуцца, а адразу запісваецца тэма вучэбных заняткаў

пасярэдзіне таго ж радка, на якім запісана дата выканання навучальнай работы, або від работы (сачыненне і іншыя работы). Запіс у сшытку афармляецца наступным чынам:

*Жыццёвы і творчы шлях І. Шамякіна* *15.09.2020*

*Агульная характарыстыка галагенаў* *12.09.2020*

Пры выкананні кантрольнай, практычнай або лабараторнай работы ў адпаведным сшытку запіс афармляецца наступным чынам:

*Практычная работа № 6* *22.10.2020*
*Рашэнне эксперыментальных задач*

У сшытках для кантрольных работ па вучэбных прадметах ”Матэматыка“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Біялогія“, ”Хімія“ ў V–XI (XII) класах пасля запісаў даты і назвы віду работы ўказваецца тэма, па якой выконваецца кантрольная работа, а затым у цэнтры радка – нумар варыянта (*Варыянт 2* або *Варыянт II*).

23. Экзаменацыйныя работы па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Матэматыка“ па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі выконваюцца на падвойных лістах паперы з адбіткам штампа ўстановы адукацыі, якія ўкладваюцца адзін у адзін.

На адбітку штампа ўстановы адукацыі запісваецца дата правядзення выпускнога экзамену.

Напрыклад: *1 чэрвеня 2021 г.*

Пасля адбітку штампа ўстановы адукацыі прапускаюцца два радкі (дзве лінейкі) на лістах паперы з разлінoўкай у лінейку, чатыры радкі (чатыры клеткі ўніз) на лістах паперы з разлінoўкай у клетку і пасярэдзіне радка робіцца адпаведны запіс.

Тытульны ліст экзаменацыйнай работы па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі афармляецца згодна з дадаткам 7 Метадычных рэкамендацый.

Па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ на другой старонцы пасярэдзіне першага радка пішацца назва дыктанта або пераказу, па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ – нумар варыянта.

Пры абазначэнні нумара варыянта можна выкарыстоўваць як арабскія, так і рымскія лічбы (*Варыянт 2* або *Варыянт II*).

Заданні экзаменацыйнай работы па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ не перапісваюцца.

24. Экзаменацыйныя работы вучняў пасля праверкі і выстаўлення адзнакі ў балах падпісваюцца старшынёй і членамі экзаменацыйнай камісіі згодна з дадаткам 7 да Метадычных рэкамендацый.

## V. ПРАВЕРКА НАВУЧАЛЬНЫХ, КАНТРОЛЬНЫХ, ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ РАБОТ І ПРАВЯДЗЕННЕ РАБОТЫ НАД ПАМЫЛКАМІ

25. Па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Матэматыка“ правяраюцца:

кожная навучальная работа ў сшытках для навучальных работ да наступных вучэбных заняткаў ва ўсіх вучняў I–IV класаў;

найбольш значныя (на выбар настаўніка) навучальныя работы ў вучняў V– XI (XII) класаў:

не менш чым адзін раз на тыдзень ва ўсіх вучняў V–VII класаў;

не менш чым адзін раз на два тыдні ва ўсіх вучняў VIII–IX класаў,

не менш чым адзін раз на месяц ва ўсіх вучняў X–XI (XII) класаў пры вывучэнні прадмета на базавым узроўні;

не менш чым адзін раз на два тыдні ва ўсіх вучняў X–XI (XII) класаў пры вывучэнні прадмета на павышаным узроўні.

26. Па вучэбным прадмеце ”Замежная мова“ ў сшытку для навучальных работ правяраюцца:

кожная навучальная работа ў вучняў III–VII класаў да наступных вучэбных заняткаў;

найбольш значныя (на выбар настаўніка) навучальныя работы ў вучняў VIII–XI (XII) класаў, але з такім разлікам, каб адзін раз на тыдзень адпаведныя навучальныя работы правяраліся ва ўсіх вучняў VIII і IX класаў, адзін раз на два тыдні ва ўсіх вучняў X–XI (XII) класаў пры вывучэнні на базавым узроўні; адзін раз на тыдзень ва ўсіх вучняў X–XI (XII) класаў пры вывучэнні на павышаным узроўні.

27. Па вучэбным прадмеце “Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)” найбольш значныя (на выбар настаўніка) навучальныя работы правяраюцца ў кожнага вучня не радзей за адзін раз у чвэрць (напрыклад, у якасці заліковых).

28. Па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“, ”Чалавек і свет“, ”Сусветная гісторыя“, ”Гісторыя Беларусі“, ”Грамадазнаўства“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Хімія“, ”Біялогія“, ”Геаграфія“, ”Інфарматыка“ найбольш значныя (на выбар настаўніка) навучальныя работы правяраюцца ў кожнага вучня не радзей за адзін раз у месяц.

29. Адзнакі за выкананне вучнямі III–XI (XII) класаў навучальных работ, выстаўленыя ў сшытках для навучальных работ па адпаведным

вучэбным прадмеце, па меркаванні настаўніка могуць заносіцца ў класны журнал і дзённік вучня.

30. Па вучэбным прадмеце ”Фізіка“ лабараторныя работы правяраюцца ў кожнага вучня да наступных вучэбных заняткаў. Адзнакі за лабараторныя работы, выстаўленыя ў сшытках для лабараторных работ, заносяцца ў класны журнал і дзённік вучня.

Па вучэбным прадмеце ”Хімія“ практычныя работы правяраюцца ў кожнага вучня да наступных вучэбных заняткаў. Адзнакі, выстаўленыя ў сшытках для практычных работ, заносяцца ў класны журнал і дзённік вучня;

Па вучэбным прадмеце ”Біялогія“:

лабараторныя і найбольш значныя (па меркаванні настаўніка) практычныя работы правяраюцца ў кожнага вучня да наступных вучэбных заняткаў. Адзнакі за лабараторныя і практычныя работы, выстаўленыя ў сшытках для лабараторных і практычных работ, заносяцца ў класны журнал і дзённік вучня;

адзнакі за навучальныя работы (у тым ліку вопыты, доследы, справаздачы па выніках экскурсій) выстаўляюцца ў класны журнал і дзённікі вучняў па меркаванні настаўніка.

Па вучэбным прадмеце ”Геаграфія“ практычныя работы правяраюцца да наступных вучэбных заняткаў у кожнага вучня. Адзнакі за практычныя работы (пазначаныя зорачкай у вучэбнай праграме), выстаўленыя ў сшытках для практычных работ вучняў, заносяцца ў класны журнал і дзённік вучня; адзнакі за іншыя практычныя работы заносяцца ў класны журнал і дзённік вучня па меркаванні настаўніка.

31. Кантрольныя работы правяраюцца ў кожнага вучня I–XI (XII) класаў. Па выніках праверкі кантрольных работ вучням III–XI (XII) класаў выстаўляюцца адзнакі ў сшытках для кантрольных работ па адпаведных вучэбных прадметах. За кантрольныя пераказы і сачыненні па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ вучням выстаўляюцца дзве адзнакі: адна – за змест, другая – за пісьменнасць. Адзнакі, выстаўленыя па выніках кантрольных работ, заносяцца ў класны журнал і дзённік вучня. За кантрольныя сачыненні па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“ вучням выстаўляюцца дзве адзнакі: адна – за змест з улікам зместавых і маўленчых памылак, другая – за пісьменнасць. Адзнакі, выстаўленыя па выніках кантрольнага сачынення, заносяцца ў класны журнал (першая – на старонку журнала па літаратуры, другая – на старонку журнала па мове) і дзённік вучня.

Праверка кантрольных работ, як правіла, ажыццяўляецца да наступных вучэбных заняткаў па адпаведным вучэбным прадмеце. Дапускаецца ажыццяўляць праверку кантрольных сачыненняў, пераказаў і іншых творчых работ па мовах і літаратурах у V–VIII класах на працягу

тыдня, у IX класе – на працягу дзесяці дзён, у X–XI (XII) класах – на працягу двух тыдняў пасля правядзення адпаведнай творчай работы.

32. Па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Беларуская літаратура“, ”Русский язык“, ”Русская литература“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“ ў навучальных работах, якія правяраюцца, і кантрольных работах настаўнік адзначае і выпраўляе дапушчаныя вучнямі памылкі наступным чынам.

Няправільна напісаную (напісаны):

літару або знак прыпынку закрэслівае наўскос, падкрэслівае адной лініяй;

лічбу закрэслівае наўскос;

частку слова, сказ закрэслівае тонкай гарызантальнай лініяй;

памылкі ў змесце і маўленчыя памылкі падкрэслівае хвалістай лініяй;

замест закрэсленага запісвае ўверсе правільны варыянт (патрэбныя лічбы, літары, знакі прыпынку, словы, словазлучэнні, сказы).

Выпраўленыя памылкі адзначаюцца на палях сшытка наступнымі ўмоўнымі знакамі:

у II–IV класах – I – арфаграфічная, V – пунктуацыйная, I (н) – нягрубая арфаграфічная, V (н)– нягрубая пунктуацыйная, З (С) – памылка ў змесце (в содержании); М (Р) – маўленчая (речевая);

у V–XI (XII) класах – I – арфаграфічная; V – пунктуацыйная; Г – граматычная; З (С) – памылка ў змесце (в содержании); М (Р) – маўленчая (речевая); а (о) – аднатыпная (однотипная); н – нягрубая: I (а) (I (о)), I (н), V (н).

Дапушчаныя вучнямі памылкі на прымяненне правілаў, якія яшчэ не вывучаліся, настаўнік падкрэслівае, выпраўляе, але на палях сшытка не адзначае.

У V–XI (XII) класах пры праверцы дыктанта пасля тэксту (у пачатку наступнага радка) дробам указваецца колькасць арфаграфічных памылак (лічнік) і пунктуацыйных памылак (назоўнік).

Напрыклад:

*I / V* 2/1

У навучальных і кантрольных творчых работах (пераказы, сачыненні, пераклады і іншыя) настаўнік выпраўляе арфаграфічныя, пунктуацыйныя, граматычныя, маўленчыя памылкі, памылкі ў змесце і выстаўляе дзве адзнакі: адну – за змест, другую – за пісьменнасць.

Пры праверцы творчых работ (пераказаў, сачыненняў, перакладаў і іншых), якія разлічаны на адны або двое вучэбных заняткаў, пасля тэксту (у пачатку наступнага радка) настаўнік запісвае дробам у лічніку колькасць памылак у змесце і маўленчых памылак, а ў назоўніку ўказвае колькасць арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак.

Напрыклад:

$$\frac{3 - M}{I - V - \Gamma} \qquad \frac{2\text{-}2}{2\text{-}2\text{-}1}$$

Калі вучнямі дапушчаны выпраўленні на месцы арфаграм і пунктаграм, якія ўплываюць на выстаўленне адзнакі за пісьмовую работу, па меркаванні настаўніка наяўнасць выпраўленняў можна адзначаць пасля падліку памылак. У гэтым выпадку запіс можна аформіць наступным чынам:

*1/0 2 выпр. (I)* *1-0*
*3-0-2 2 выпр. (V)*

Пры праверцы экзаменацыйных работ вучняў па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ дапушчаныя вучнямі памылкі адзначаюцца, выпраўляюцца і фіксуюцца такім жа чынам, як і пры праверцы дыктанта, творчых работ.

33. Па іншых вучэбных прадметах у навучальных работах, якія правяраюцца, і кантрольных работах настаўнік закрэслівае арфаграфічныя, пунктуацыйныя, граматычныя памылкі і надпісвае правільны варыянт, маўленчыя памылкі падкрэслівае хвалістай лініяй.

Пры праверцы экзаменацыйных работ вучняў па завяршэнні навучання і выхавання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ такім жа чынам выпраўляюцца дапушчаныя вучнямі памылкі.

34. У сшытках для навучальных і кантрольных работ па вучэбных прадметах ”Матэматыка“, ”Фізіка“, ”Біялогія“, ”Хімія“, у сшытках для навучальных работ па іншых вучэбных прадметах пры праверцы дадатковых заданняў, тэставых работ, у экзаменацыйнай рабоце па вучэбным прадмеце ”Матэматыка“ на палях насупраць кожнага выкананага задання адзначаецца колькасць балаў, якой ацэнены вынік выканання гэтага задання. Пасля рашэння апошняга задання запісваецца сумарная колькасць балаў за выкананне ўсіх заданняў, якія пераводзяцца ў адпаведную адзнаку. Адзнака запісваецца на адпаведным радку.

Па вучэбных прадметах ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“ пасля праверкі навучальнай творчай работы дапускаецца сціслае пісьмовае ацэначнае меркаванне настаўніка.

35. Вучні II–IV класаў выконваюць работу над памылкамі пасля кожнай работы ў тых жа сшытках, у якіх выконвалася адпаведная

навучальная або кантрольная работа. Узор выканання работы над памылкамі дае настаўнік.

36. Вучнямі V–XI (XII) класаў работа над памылкамі выконваецца па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Беларуская літаратура“, ”Русский язык“, ”Русская литература“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Літаратура нацыянальнай меншасці“, ”Фізіка“, ”Астраномія“, ”Хімія“, ”Біялогія”, ”Матэматыка“ пасля правядзення настаўнікам аналізу выканання кантрольнай або найбольш значнай (па меркаванні настаўніка) навучальнай, практычнай, лабараторнай работы па адпаведным вучэбным прадмеце ў тых жа сшытках, у якіх выконвалася работа.

Па вучэбным прадмеце ”Інфарматыка“ тыповыя памылкі, дапушчаныя вучнямі пры выкананні кантрольнай работы, абмяркоўваюцца без выканання пісьмовай работы над памылкамі.

37. Выпраўленне памылак, дапушчаных вучнем, надпісванне правільнага варыянта, іншыя запісы ажыццяўляюцца ручкай з пастай чырвонага колеру. Памылкі, дапушчаныя пры выкананні работы над памылкамі, выпраўляюцца такім жа чынам, як і пры праверцы навучальнай або кантрольнай работы па адпаведным вучэбным прадмеце.

38. Па выніках праверкі работы над памылкамі па меркаванні настаўніка можа быць выстаўлена адзнака, якая можа быць занесена ў класны журнал і дзённік вучня.

## VI. АФАРМЛЕННЕ РЭФЕРАТА

39. Рэферат – гэта кароткая перадача зместу артыкула (-аў) або даследавання. Рэфераты могуць выконвацца па ўсіх вучэбных прадметах, якія вывучаюцца ў X–XI (XII) класах.

Рэферат мае наступную структуру: тытульны ліст, змест, уводзіны, асноўная частка, якая падзяляецца на главы, раздзелы, падраздзелы, заключэнне, спіс літаратуры ў алфавітным парадку, дадаткі (пры неабходнасці). Аб’ём навучальнага рэферата, узор яго афармлення ўстаноўлены згодна з дадаткам 8 да Метадычных рекамендацый.

40. На тытульным лісце ўказваецца найменне ўстановы адукацыі, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі ёсць) аўтара, назва работы, месца знаходжання ўстановы адукацыі, год.

41. Змест рэферата ўключае назву структурных частак, глаў, раздзелаў і падраздзелаў з указаннем нумарацыі старонак арабскімі лічбамі.

42. Ва ўводзінах даецца кароткая характарыстыка тэмы рэферата, абгрунтоўваецца яе актуальнасць, раскрываюцца мэта і задачы работы, даецца пералік літаратуры і асноўных крыніц, на аснове якіх падрыхтаваны рэферат.

43. У асноўнай частцы рэферата коратка, але поўна падаецца матэрыял па раздзелах, кожны з якіх раскрывае асобную праблему або розныя бакі адной праблемы. Кожны змястоўны блок (глава, раздзел, падраздзел) павінен мець загаловак.

44. Заключэнне павінна быць сціслым, канкрэтным, утрымліваць асноўныя вывады, а таксама інфармацыю пра згоду ці нязгоду з аўтарамі выкарыстаных крыніц. Заключэнне не павінна перавышаць па аб'ёме ўводзіны.

45. Пры напісанні рэферата неабходна рабіць спасылкі на крыніцы інфармацыі: у квадратных дужках указваецца нумар крыніцы ў спісе выкарыстаных крыніц і старонка, напрыклад: [4, с. 29]. Спасылкі ў тэксце могуць таксама падавацца ў выглядзе падрадковых заўваг, нумарацыя якіх прыводзіцца на кожнай старонцы, пачынаючы з адзінкі. Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца ў адпаведнасці з правіламі бібліяграфічнага апісання.

46. Пры камп'ютарным наборы трэба выкарыстоўваць шрыфт Times New Roman, кегль 15 пт; міжрадковы інтэрвал – 1,5; водступ першага радка кожнага абзаца – 1,25; палі – зверху і знізу па 2 см, злева 3 см, справа 1 см.

Дадатак 1
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Узоры афармлення надпісу на вокладцы сшытка*

Тетрадь
для работ
по русскому языку
учащегося 6 „А“ класса
гимназии № 61 г. Минска
Петрова Виталия

Сшытак
для кантрольных работ
па беларускай мове
вучаніцы II класа
Выгалавіцкай базавай школы
Данільчык Вольгі

Тетрадь
для работ по учебному предмету
„Человек и мир“
учащейся V „Б“ класса
средней школы № 4 г. Витебска
Куницкой Елены

Сшытак
для работ
па матэматыцы
вучня 8 „А“ класа
сярэдняй школы № 2
г. Наваполацка
Фёдарава Аляксандра

Тетрадь
для практических работ
по химии
учащегося X „А“ класса
средней шолы № 1 г. Слуцка
Симончика Михаила

Сшытак
для лабараторных работ
па фізіцы
вучня 9 класа
Засульскай сярэдняй школы
Платонава Івана

Тетрадь
для работ
по обществоведению
учащегося 10 „А“ класса
Лицея БГУ
Нестерова Владимира

Тетрадь
для работ
по русской литературе
учащегося IX класса
Правомостовской
средней школы
Платонова Ивана

---

* Дапускаецца абазначэнне класа як арабскімі, так і рымскімі лічбамі.

| English | Français | Deutsch | Español | 姓名 |
|---|---|---|---|---|
| Galina Sedova | Svetlana Ivanova | Anna Petrova | Anna Ivanova | 学校 |
| Form 3 „B“ | classe de 7ème „A“ | Klasse 5 „B“ | grado 4 “A” | 班级 |
| School No. 20 | école № 20 | Schule Nr. 20 | escuela № 20 | |

Дадатак 2
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Колькасць і аб’ём навучальных работ па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вучэбны прадмет ”Беларуская мова“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
| | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе |
| Пераказ | – | – | 1 45-50 слоў | 1 45-50 слоў | 1 40-50 слоў | 1 50-60 слоў | 1 60-70 слоў | 1 70-80 слоў |
| Сачыненне | – | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Вучэбны прадмет ”Беларуская мова“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе |
| Пераказ | – | – | – | 1 40-45 слоў | 1 40-50 слоў | 1 50-60 слоў | 1 60-70 слоў | 1 70-80 слоў |
| Сачыненне | – | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Вучэбны прадмет ”Русский язык“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе |
| Пераказ | – | – | 1 30-40 слоў | 1 40-50 слоў | 1 40-50 слоў | 1 50-60 слоў | 1 60-70 слоў | 1 70-80 слоў |
| Сачыненне | – | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Вучэбны прадмет ”Русский язык“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе |
| Пераказ | – | – | 1 40-50 слоў | 1 40-50 слоў | 1 45-50 слоў | 1 50-60 слоў | 1 60-70 слоў | 1 70-80 слоў |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сачыненне | – | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Вучэбны прадмет ”Мова нацыянальнай меншасці“ | | | | | | | | |
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паў-<br>годдзе | II паў-<br>годдзе | I паў-<br>годдзе | II паў-<br>годдзе | I паў-<br>годдзе | II паў-<br>годдзе | I паў-<br>годдзе | II паў-<br>годдзе |
| Пераказ | – | – | – | – | 1<br>40-45<br>слоў | 1<br>50–55<br>слоў | 1<br>60–65<br>слоў | 1<br>70–75<br>слоў |
| Сачыненне | – | – | – | – | – | – | – | 1 |

Дадатак 3
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Колькасць кантрольных работ на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, іх віды і аб’ём

| Вучэбны прадмет ”Беларуская мова“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Від работы | І клас | | ІІ клас | | ІІІ клас | | ІV клас | |
| | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе |
| Кантрольнае спісванне | – | 1<br>15-20<br>слоў | 1<br>25-30<br>слоў | – | – | – | – | – |
| Кантрольны дыктант | – | – | – | 1<br>35-40<br>слоў | 1<br>40-45 слоў | – | 1<br>55-65<br>слоў | – |
| Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем | – | – | – | – | – | 1<br>45-50<br>слоў | – | 1<br>65-75<br>слоў |
| Кантрольная работа па тэме | – | – | 1 | 2 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| Кантрольны слоўнікавы дыктант | – | – | 1<br>6 слоў | 1<br>7 слоў | 2<br>8 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>12 слоў |

| Вучэбны прадмет ”Беларуская мова“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Від работы | І клас | | ІІ клас | | ІІІ клас | | ІV клас | |
| | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе | І паў-годдзе | ІІ паў-годдзе |
| Кантрольнае спісванне | – | – | 1<br>20-25<br>слоў | – | – | – | – | – |
| Кантрольны дыктант | – | – | – | 1<br>25-30<br>слоў | 1<br>40-45 слоў | – | 1<br>55-65<br>слоў | – |
| Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем | – | – | – | – | – | 1<br>45-50<br>слоў | – | 1<br>65-75<br>слоў |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Кантрольная работа па тэме | – | – | 1 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| Кантрольны слоўнікавы дыктант | – | – | 1<br>5 слоў | 1<br>6 слоў | 2<br>8 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>12 слоў |
| Вучэбны прадмет ”Русский язык“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе |
| Кантрольнае спісванне | – | 1<br>15-20 слоў | 1<br>25-30 слоў | – | – | – | – | – |
| Кантрольны дыктант | – | – | – | 1<br>35-40 слоў | 1<br>40-45 слоў | – | 1<br>55-65 слоў | – |
| Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем | – | – | – | – | – | 1<br>45-50 слоў | – | 1<br>65-75 слоў |
| Кантрольная работа па тэме | – | – | 1 | 2 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| Кантрольны слоўнікавы дыктант | – | – | 1<br>6 слоў | 1<br>8 слоў | 2<br>8 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>12 слоў |
| Вучэбны прадмет ”Русский язык“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе | I паў-годдзе | II паў-годдзе |
| Кантрольнае спісванне | – | – | 1<br>25-30 слоў | – | – | – | – | – |
| Кантрольны дыктант | – | – | – | 1<br>35-40 слоў | 1<br>40-45 слоў | – | 1<br>55-65 слоў | – |
| Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем | – | – | – | – | – | 1<br>45-50 слоў | – | 1<br>65-75 слоў |
| Кантрольная работа па тэме | – | – | 1 | 2 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| Кантрольны слоўнікавы дыктант | – | – | 1<br>6 слоў | 1<br>8 слоў | 2<br>8 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>10 слоў | 2<br>12 слоў |

| Вучэбны прадмет ”Мова нацыянальнай меншасці” | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Кантрольнае спісванне | – | – | 1<br>15-20 слоў | 1<br>20-25 слоў | – | – | – | – |
| Кантрольны дыктант | – | – | – | – | 1<br>35-40 слоў | – | 1<br>55-60 слоў | – |
| Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем | – | – | – | – | – | 1<br>35-40 слоў | – | 1<br>55-60 слоў |
| Кантрольная работа па тэме | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 2 |
| Кантрольны слоўнікавы дыктант | – | – | – | – | 1<br>6 слоў | 1<br>6 слоў | 1<br>8 слоў | 1<br>8 слоў |

| Вучэбны прадмет ”Беларуская літаратура“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Праверка навыку чытання | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў | – | – | – | – | – | 1 | – | 1 |

| Вучэбны прадмет ”Беларуская літаратура“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Праверка навыку чытання | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў | – | – | – | – | – | 1 | – | 1 |

| Вучэбны прадмет ”Русская литература“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання |
|---|

| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Праверка навыку чытання | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў | – | – | – | – | – | 1 | – | 1 |

Вучэбны прадмет ”Русская литература“ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Праверка навыку чытання | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў | – | – | – | – | – | 1 | – | 1 |

Вучэбны прадмет ”Літаратура нацыянальнай меншасці“

| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Праверка навыку чытання | – | 1 | – | 1 | – | 1 | – | 1 |
| Праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў | – | – | – | – | – | 1 | – | 1 |

Вучэбны прадмет ”Матэматыка“

| Від работы | I клас | | II клас | | III клас | | IV клас | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе | I паўгоддзе | II паўгоддзе |
| Кантрольная работа | - | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| Праверка навыкаў вуснага лічэння | - | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |

Дадатак 4
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## Колькасць кантрольных работ на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі

| Віды работ | Колькасць кантрольных работ у навучальны год па класах | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | V* | VI* | VII* | VIII* | IX* | X* (базавы/ павыш.) | XI* (базавы/ павыш.) |
| Вучэбны прадмет ”Беларуская мова“ | | | | | | | |
| Дыктанты | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2/2 | 2/2 |
| Пераказы | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2/2 | 2/2 |
| Тэставая работа | – | – | – | 1 | 1 | 1/2 | 1/2 |
| Сачыненні | | | | | | 0/1 | 0/1 |
| Вучэбны прадмет ”Беларуская літаратура“ | | | | | | | |
| Сачыненні | – | – | – | – | 1 | 2/4 | 2/4 |
| Вучэбны прадмет ”Русский язык“ | | | | | | | |
| Дыктанты | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2/2 | 2/2 |
| Пераказы | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2/2 | 2/2 |
| Тэставая работа | – | – | – | 1 | 1 | 1/2 | 1/2 |
| Сачыненні | | | | | | 0/1 | 0/1 |
| Вучэбны прадмет ”Русская литература“ | | | | | | | |
| Сачыненні | – | – | – | – | 1 | 2/4 | 2/4 |
| | | | | | | | |
| Вучэбны прадмет ”Мова нацыянальнай меншасці“ | | | | | | | |
| Дыктанты | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| Пераказы | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| Іншыя вучэбныя прадметы | | | | | | | |
| Вучэбныя прадметы | Колькасць кантрольных работ у навучальны год па класах | | | | | | |
| | V* | VI* | VII* | VIII* | IX* | X* (базавы/ павыш.) | XI* (базавы/ павыш.) |
| Матэматыка | 6 | 6 | 8 | 8 | 8 | 6/8 | 6/8 |
| Фізіка | – | – | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 |
| Хімія | – | – | 2 | 4 | 4 | 4/6 | 4/6 |
| Біялогія | – | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| Інфарматыка | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 1/3 | 1/3 |
| Астраномія | – | – | – | – | – | – | 2 |

* Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, на базе якіх ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць па праекце ”Апрабацыя эксперыментальных інтэграваных вучэбных планаў і вучэбных праграм ва ўмовах абноўленага зместу дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання“, колькасць і віды кантрольных работ па вучэбных прадметах вызначаецца згодна з эксперыментальнымі вучэбнымі праграмамі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі ва ўстаноўленым парадку.

Дадатак 5
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Аб’ём тэкстаў кантрольных работ (дыктант, пераказ, сачыненне), аб’ём слоўнікавага дыктанта па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“, ”Беларуская літаратура“, ”Русская литература“ на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі

| Клас | Аб’ём тэксту дыктанта | Аб’ём слоўнікавага дыктанта |
|---|---|---|
| V | 80 –90 слоў | 12–15 слоў |
| VI | 90–100 слоў | 15–20 слоў |
| VII | 100–110 слоў | 20–25 слоў |
| VIII | 110–125 слоў | 25–30 слоў |
| IX | 125–145 слоў | 30–35 слоў |
| X | 145–170 слоў | 35–40 слоў |
| XI | 170–200 слоў | 40–45 слоў |

| Клас | Аб’ём тэксту для пераказу |
|---|---|
| V | 80–100 слоў |
| VI | 100–120 слоў |
| VII | 120–180 слоў |
| VIII | 180–240 слоў |
| IX | 240–340 слоў |
| X | 340–450 слоў |
| XI | 450–600 слоў |

| Клас | Аб’ём сачынення |
|---|---|
| V | 0,5–1 старонка |
| VI | 1–1,5 старонкі |
| VII | 1–1,5 старонкі |
| VIII | 1,5–2 старонкі |
| IX | 2–3 старонкі |
| X | 3–4 старонкі |
| XI | 4–5 старонак |

Дадатак 6
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Колькасць відаў арфаграм і пунктаграм у тэкстах кантрольных дыктантаў па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“, ”Русский язык“, ”Мова нацыянальнай меншасці“ на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі

| Клас | Колькасць відаў арфаграм у тэкстах кантрольных дыктантаў | Колькасць відаў пунктаграм у тэкстах кантрольных дыктантаў |
|---|---|---|
| V | 10 | 2–3 |
| VI | 12 | 3–4 |
| VII | 16 | 4–5 |
| VIII | 20 | 5–6 |
| IX | 24 | 7–10 |
| X | 26 | 10–15 |
| XI | 28 | 15–20 |

Дадатак 7
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Афармленне тытульнага ліста, подпісаў экзаменацыйнай работы

I. Узоры афармлення тытульнага ліста экзаменацыйнай работы па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

*Экзаменацыйная работа (дыктант)*
*па беларускай мове*
*вучаніцы 9 ”Б“ класа*
*Кавалевіч Вольгі Пятроўны*

*Экзаменационная работа (диктант)*
*по русскому языку*
*учащейся IX ”Б“ класса*
*Ковалевич Ольги Петровны*

*Экзаменацыйная работа (дыктант)*
*па літоўскай мове*
*вучня 9 класа*
*Блажукаса Томаса Рэналдавіча*

*Экзаменационная работа (диктант)*
*по литовскому языку*
*учащегося IX класса*
*Блажукаса Томаса Реналдовича*

*Экзаменацыйная работа (дыктант)*
*па польскай мове*
*вучаніцы 9 класа*
*Кавальскай Дануты Казіміраўны*

*Экзаменационная работа (диктант)*
*по польскому языку*
*учащейся IX класса*
*Ковальской Дануты Казимировны*

*Экзаменацыйная работа*
*па матэматыцы*
*вучня 9 ”В“ класа*
*Станкевіча Сяргея Іванавіча*

*Экзаменационная работа*
*по математике*
*учащегося IX ”В“ класса*
*Станкевича Сергея Ивановича*

II. Узоры афармлення тытульнага ліста экзаменацыйнай работы па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

*Экзаменацыйная работа (пераказ)*
*па беларускай мове*
*вучаніцы 11 ”Б“ класа*
*Сідаровіч Ірыны Уладзіміраўны*

*Экзаменационная работа (изложение)*
*по русскому языку*
*учащейся XI ”Б“ класса*
*Сидорович Ирины Владимировны*

| | |
|---|---|
| *Экзаменацыйная работа (пераказ)* | *Экзаменационная работа (изложение)* |
| *па літоўскай мове* | *по литовскому языку* |
| *вучня 11 класа* | *учащегося XI класса* |
| *Блажукаса Томаса Рэналдавіча* | *Блажукаса Томаса Реналдовича* |
| | |
| *Экзаменацыйная работа* | *Экзаменационная работа* |
| *па матэматыцы* | *по математике* |
| *вучаніцы 11 ”В“ класа* | *учащейся Х1 ”В“ класса* |
| *Шыманскай Тамары Пятроўны* | *Шиманской Тамары Петровны* |

III. Подпіс экзаменацыйных работ вучняў старшынёй і членамі экзаменацыйнай камісіі:

*10*
(адзнака)

| | | |
|---|---|---|
| *Старшыня экзаменацыйнай камісіі* | (подпіс) | *Т.І. Пятрова* |
| *Члены экзаменацыйнай камісіі:* | (подпіс) | *А.Г. Лявонаў* |
| | (подпіс) | *Н.І. Мікалаева* |

*10/9*
(отметки)

| | | |
|---|---|---|
| *Председатель экзаменационной комиссии* | (подпись) | *Т.И. Петрова* |
| *Члены экзаменационной комиссии:* | (подпись) | *А.Г. Леонов* |
| | (подпись) | *Н.И. Николаева* |
| | (подпись) | *Г.П.Сидоров* |

Дадатак 8
да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

Аб'ём, афармленне і структура рэферата

*I. Аб'ём*

| Рэферат | Клас | Аб'ём рэферата пры камп'ютарным наборы | Аб'ём рэферата пры напісанні ад рукі |
|---|---|---|---|
| Навучальны | X | 12–14 старонак | 14–15 старонак |
| Навучальны | XI | 15–17 старонак | 17–19 старонак |

*II. Афармленне тытульнага ліста**

Найменне ўстановы адукацыі

Назва рэферата

Выканаў(ла)
Прозвішча, імя ўласнае, імя па бацьку (калі ёсць)
вучань(іца) ___ класа

Месца знаходжання ўстановы адукацыі, год напісання рэферата

*III. Структура*

Змест рэферата ўключае назвы структурных частак, глаў, раздзелаў і падраздзелаў з указаннем нумарацыі старонак арабскімі лічбамі. Напрыклад:

Змест**
Уводзіны
1. Назва главы
   1.1.Назва раздзела
   1.2. Назва раздзела
      1.2.1. Назва падраздзела
      1.2.2. Назва падраздзела
2. Назва главы
Заключэнне
Спіс выкарыстаных крыніц
Дадаткі

* Нумар на тытульным лісце не ўказваецца, але пры нумарацыі ўлічваецца.
** Размяшчаецца пасля тытульнага ліста.